ва ўсім свеце мае агульныя карані, і прынцып ткацтва застаецца нязменным.

1. *Курыловіч Г.М.* Ткацкі стан // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. — Мн., 1989. — С. 495—497.

2. *Неелов В.И.* Ткачество: от плетельных рам до многозевных машин. — М., 1986. — 170 с.

3. *Hand weaving* // Encyclopaedia Britannica: In 24 vol. Volume 23. — Chicago; London; Toronto, 1962. — P. 375—378.

4. *Weaving* // Enciclopaedia of Crafts. — London, 1978. — P. 215—230.

Г.М.Водчыц,
*аспірантка*

## СТВАРЭННЕ СЦЭНІЧНАЙ ХАРЭАГРАФІІ НА АСНОВЕ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ ТВОРАЎ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з найбольш складаных і вострых праблем сучаснага харэаграфічнага мастацтва з'яўляецца праблема стварэння арыгінальнага рэпертуару. Гэта патрабуе пашырэння кола крыніц, у тым ліку нехарэаграфічных, для стварэння харэаграфічных нумароў. У такім сэнсе беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва выкарыстоўваецца ў якасці ўскоснай крыніцы побач з народнай музыкай і песняй, казкай і паданнем, гульнямі і тэатральнымі дзеяннямі, традыцыямі і абрадамі. Аб прамым пераносе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў харэаграфію гаварыць не даводзіцца ўжо хаця б таму, што яны аперыруюць своеасаблівымі сістэмамі сродкаў выразнасці. У творах прыкладнога мастацтва — гэта форма, колер, фактура, кампазіцыйная пабудова. У харэаграфіі — рух, малюнак танца, пластыка, поза, харэаграфічны вобраз, драматургічнае развіццё. У сувязі з гэтым пры пераносе твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў харэаграфію адбываецца працэс інтэрпрэтацыі, творчае

пераасэнсаванне, вычляненне галоўнага вобраза ці прыёму і далейшае іх развіццё ў харэаграфічнай традыцыі сродкамі танца.

У якасці прыёму можа быць выкарыстаны сам творчы працэс стварэння таго ці іншага твора прыкладнога мастацтва. Так, у беларускім харэаграфічным фальклоры існуюць узоры карагодаў, у якіх узнаўляецца працэс ткацтва. На іх прыкладзе мы можам вылучыць два асноўныя падыходы да стварэння твора ў харэаграфіі.

Першы — ілюстрацыйна-пераймальны, як у гульнёвым карагодзе "Ах, мы сеялі, сеялі лянок", дзе народныя выканаўцы пры дапамозе рухаў імітуюць сеў, праполку, уборку, малацьбу, апрацоўку ільну, ткацтва, адбельванне, мыццё палатна і рассціланне яго па зямлі. Карагод выконваўся ў суправаджэнні песні, якая апавядала аб усіх падрабязнасцях выпрацоўкі ільняной тканіны. Галоўныя функцыі такіх танцаў у традыцыйнай культуры — перадача ведаў аб адпаведным працоўным працэсе маладым, а таксама варажба на добры ўраджай.

Другі падыход больш складаны, можна сказаць, больш прафесійны. Так, у вясновым карагодным танцы працэс ткацтва ўзнаўляецца ва ўмоўным, абагульненым выглядзе, творча пераасэнсоўваецца. Асноўны змест карагода— апавяданне аб лёсе жанчыны, яно суправаджаецца паказам асноўных хатніх спраў. Так, для перадачы руху чаўнака папярок асновы яны перакідваюць на руках дзіця ад адной пары да другой, пакуль не дойдуць да апошняй, дзе яго бярэ на рукі жанчына, якая ўвасабляе ткачыху. А дла паказу працэсу снавання ніці вядуць бясконцы "крывы танок". Трэба заўважыць, што ў песенным суправаджэнні няма ніякага ўспаміну аб ткацтве. У песні апавядаецца аб цяжкім жыцці жанчыны ў сям'і мужа, аб узаемаадносінах паміж маладымі хлопцамі і дзяўчатамі.

У наш час абодва названыя карагоды ляглі ў аснову цэлага раду сцэнічных танцаў, дзе балетмайстры ў ілюстрацыйным або ў абагульненым выглядзе прадстаўляюць працэс ткацтва.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Багатай інфармацыйнай крыніцай для харэаграфічнага мастацтва з'яўляецца таксама арнамент. Ён утрымлівае вялікую колькасць геаметрычных і раслінных малюнкаў, якія можна перанесці ў танец. Можна выкарыстаць паэтычныя вобразы і сімвалы, якія змяшчаюць традыцыйныя элементы, што складаюць арнамент, у фарміраванні задумы нумара шляхам дэшыфроўкі іх значэння.

Нельга пакідаць без увагі таксама перайманне кампазіцыйных прыёмаў, якія адлюстроўваюць агульнамастацкія прынцыпы пабудовы арнаменту і ўзнаўлення агульных стылявых яго асаблівасцей пры стварэнні харэаграфічнага твора.

У працэсе інтэрпрэтацыі адбываецца раздзяленне арнаменту на складаныя часткі, тлумачэнне традыцыйных элементаў, асэнсаванне кампазіцыйнай пабудовы, прымяненне прыёмаў сіметрыі, характэрных для ўтварэння арнаменту. Дэшыфроўка арнаменту нараджае персанажы танца, а таксама сцэнічнае дзеянне.

Кампазіцыйна магчыма гарызантальнае і вертыкальнае тлумачэнне арнаменту. Першае атрымлівае найбольш яркае ўвасабленне ў малюнку танца, другое — у пабудове харэаграфічных поз, асабліва плённа ўжыванне арнаменту ў стварэнні фінальнай позы, аднаго з харэаграфічных прыёмаў заканчэння нумара.

У працэсе інтэрпрэтацыі арнаменту ў харэаграфіі вялікую ролю мае разуменне прыёму гледачом, усведамленне таго, што перад ім арнамент.

Акрамя ткацтва, харэографы звяртаюцца і да твораў іншых відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У гэтым сэнсе цікава прасачыць, як беларускія балетмайстры выкарыстоўваюць вобразы народнай саламянай лялькі, выявы людзей і жывёл у сваіх творах. У сучаснай сцэнічнай харэаграфіі ёсць некалькі прыкладаў такой інтэрпрэтацыі. Гэта нумары "Саламяныя хлапчукі" ў народным ансамблі танца "Белая Русь" і "Саламяныя лялькі" ва ўзорным ансамблі "Зубраня" (балетмайстар А.Карповіч). У гэтых

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

нумарах вобраз саламянай лялькі ўзнаўляецца харэаграфічнымі сродкамі і з дапамогай касцюма, які вырашаны ў залатым тоне і перадае фактуру і колер саломы.

Інтэрпрэтацыя ў харэаграфіі твораў керамікі магчыма ў тым выпадку, калі ў ёй увасабляюцца чалавек, жывёлы, птушкі, казачныя героі. Так, на наш погляд, беларускія харэографы павінны звярнуць увагу на ўдалы вопыт расійскіх балетмайстраў, якія скарысталі традыцыі рускай гжэлі для стварэння сцэнічнага калектыву "Гжэль". Рэпертуар яго насычаны нумарамі, дзе традыцыйны роспіс прысутнічае ў афармленні сцэнічных касцюмаў, і, акрамя гэтага, выкарыстоўваюцца асноўныя тыпажы фарфоравых статуэтак, якія ажываюць у танцавальных сюітах.

У беларускай сцэнічнай харэаграфіі можна знайсці прыклады выкарыстання мастацтва пляцення, напрыклад у нумары "Карункі" ў ансамблі "Белая Русь", дзе хараство карункаў адлюстроўваецца ў перапляценні малюнкаў і пластычнасці рухаў.

Такім чынам, сучасная беларуская харэаграфія звяртаецца да інтэрпрэтацыі твораў розных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што спрыяе насычэнню танца яркімі, багатымі па змесце вобразамі. Балетмайстры запазычваюць выяўленчыя прыёмы, якія нараджаюць у гледача дадатковыя асацыяцыі пры ўспрыманні харэаграфічнага твора. Адначасова з далучэннем элементаў іншых відаў народнага мастацтва (тэатра, музыкі і песні, элементаў абрадаў і свят) гэта спрыяе стварэнню арыгінальных харэаграфічных нумароў і ўзбагачае нацыянальную харэаграфію.

А.І.Непачаловіч,
*ст. выкладчык*

## АД МІНУЛАГА ДА БУДУЧЫНІ

Узровень нацыянальнай свядомасці залежыць ад адносін да культуры мінулага, ад традыцый і ўсяго таго,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ